Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# За ленінскія кадры

ОРГАН партбюро, камітэта ЛКСМБ, прафкома, МК і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

№ 14 (108) | 17 верасня 1940 г. | Год выдання VI

# НЯХАЙ ЖЫВЕ З'ЕДНАНЫ БЕЛАРУСКІ НАРОД

★

## ЗНАМЯНАЛЬНАЯ ДАТА

Роўна год таму назад доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія па загаду совецкага ўрада вызваліла ад панскага гнёту брацкія пароды Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Здзейснілася даўняя мара украінскага і беларускага народаў, аб з'еднанні пад чырвоным сцягам Советаў.

Як струхнелая порхаўка, рассыпалася пры першым удары вельможна-шляхецкая Польшча.

Толькі год пражылі працоўныя заходніх абласцей УССР і БССР у шчаслівай сям'і народаў СССР. А як за гэты год змяніла сваё аблічча палітая потам і крывёю зямля, як змяніліся людзі! Назаўсёды згінулі прыгнёт, галеча, беспрацоўе і цемра народная. Сталінская палітыка міру вырвала іх з вогнішча другой імперыялістычнай вайны і забяспечыла магчымасць мірнай, свабоднай і плённай працы.

Пры брацкай дапамозе ўсяго Совецкага Саюза расце социялістычная прамысловасць заходніх абласцей Украіны і Беларусі, аднаўляюцца і пашыраюцца старыя прадпрыемствы, будуюцца новыя.

Заможней зажыло працоўнае сялянства, атрымаўшы ў свае карыстанне панскія землі. Пераконваючыся ў перавагах буйнага социялістычнага земляробства, яно стварае ўсё новыя і новыя калгасы. Соцспаборніцтва і стаханаўская работа моцна ўвайшлі ў быт рабочых, калгаснікаў, сялян і працоўнай інтэлігенцыі.

Пышным цветам расцвітае нацыянальная па форме і социялістычная па зместу культура. Дзеці працоўных атрымалі магчымасць бесплатнага навучання на роднай мове. Для іх адкрыты сотні і тысячы новых пачатковых і сярэдніх школ, тэхнікумы і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Развіваюцца ўсе галіны мастацтва і літаратура. Адкрываюцца бальніцы, яслі, дзіцячыя сады.

Услед за братамі—беларусамі і украінцамі пры дапамозе РСЧА узняты былі чырвоныя сцягі советаў народамі Бесарабіі і Паўночнай Букавіны; народамі Літвы, Латвіі і Эстоніі. Нашы чырвоныя воіны перамаглі непрыступныя цвярдыні Карэльскага перашэйка, разбіўшы ўшчэнт авантуру белафінскай ваеншчыны, пацкованай і падтрыманай англа-франка-амерыканскім імперыялістычным блокам і яго падручнымі, яны заваявалі карэла-фінскаму народу форму дзяржаўнага існавання ў якасці саюзнай рэспублікі.

Пажар другой імперыялістычнай вайны прадаўжае бушаваць і ў капіталістычным свеце, пагражаючы ўсё новым народам і краінам. Толькі сталінская палітыка міру, падмацаваная магутнасцю Чырвонай Арміі, забяспечыла магчымасць мірна працаваць і развівацца нашаму 193-мільённаму совецкаму народу. Спробы паноў англа-французскіх імперыялістаў уцягнуць нас у крывавае жэрла вайны скончыліся тым, што яны, як і прадсказваў таварыш Сталін на XVIII з'ездзе ВКП(б), за гэты год не далічыліся некалькіх сваіх урадаў, а СССР павялічыў сваё насельніцтва на 23 мільёны і лік саюзных рэспублік з 11 да 16.

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна чэснай, самаадданай работай, няўхільным правядзеннем у жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г. будзем няспынна мацаваць рост абароннай магутнасці нашай радзімы, каб ніякія фокусы нашых ворагаў не засціглі нас знянацку.

★ ★ ★




## ЗБЫЛІСЯ НАШЫ МАРЫ І ЖАДАННІ

17 верасня 1939 года — адзін з самых выдатных і светлых дзён у гісторыі народаў Заходніх абласцей Беларусі і Украіны. У гэты знаменальны дзень доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія ўвайшла ў прэдзелы былой панскай Польшчы і вызваліла прыгнечаныя масы адзінакроўных братоў—беларусаў і украінцаў ад гнёту ненавісных польскіх паноў. Совецкі народ падаў нам брацкую руку дапамогі і прыняў нас ў сваю дружную сям'ю.

Усе гэтыя 20 змрочных год позіркі ўсіх працоўных Заходняй Беларусі былі звернуты на Усход, да адзінакроўнага народа, да Чырвонай Масквы, дзе жыве і працуе геній усяго чалавецтва, тварэц самай дэмакратычнай Канстытуцыі ў свеце, правадыр парабашчоных і прыгнечаных народаў — вялікі Сталін. Мы добра ведалі, што нас не забудзе вялікі совецкі народ.

Жалкім было палажэнне працоўнай моладзі. Толькі адзінкі з вялікімі цяжкасцямі маглі вучыцца. У пачатковых школах і гімназіях вучылі толькі на польскай мове, нацыянальных школ не было. У такім горадзе, як Брэст была толькі адна, і то неяк выпадкова, руская 8-класная гімназія, знаходзячыся ў непрыглядным становішчы. Навучаючыхся было мала, бо бацькоў, працуючых на дзяржаўнай службе, прымушалі вучыць сваіх дзяцей у польскіх гімназіях. Урад не аказваў нашай гімназіі ніякай падтрымкі. Кожнаму навучаючамуся патрэбна было ўносіць многа сродак за вучобу. Вучоба таксама была вельмі цяжкай, многа прадметаў выкладалася зусім непатрэбных.

У апошнія годы польскі урад яшчэ больш абмежаваў нашы, і так нязначныя, правы: было забаронена наладжваць у памяшканні гімназіі якія-б то ні былі вучнёўскія вечары, спяваць украінскія і беларускія песні.

Як радасна жыць і працаваць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Няма больш страху за заўтрашні дзень. Беспрацоўе, галеча, здзекі, праізвол канулі ў вечнасць. Пасля мрочнай кашмарнай ночы настала светлая пара будаўніцтва свайго шчаслівага жыцця без памешчыкаў і капіталістаў, у вялікім садружастве совецкага народа.

Нашай моладзі адчыніліся грамадныя невычарпальныя магчымасці працаваць, вучыцца, развіваць свае здольнасці і таланты.

Многія мае таварышы, так як і я, паступілі у вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе нас ветліва сустрэў дружны калектыў совецкіх студэнтаў.

За вызваленне, за радасць працы і жыцця мы шчыра дзякуем вялікай партыі Леніна — Сталіна, совецкаму ураду, Чырвонай Арміі і дарагому правадыру і настаўніку таварышу Сталіну. Як новыя грамадзяне совецкай краіны, мы пастараемся апраўдаць званне будаўнікоў комуністычнага грамадства.

**Т. КЛАЧКО,**
**студэнтка I курса біяфака, б. вучаніца гімназіі г. Брэста.**

★

Якуб Колас.

## СВАЙМУ НАРОДУ

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою:
Сотні новых і ясных дарог
Расцілае жыццё прад табою.

Новай долі узыходзіць зара.
Будзеш жыць ты без панскай апекі:
Адышла, адцвіла іх пара,
І панам не вярнуцца навекі.

Паглядзі, як прасторна вакруг,
Як прыціхлі палацы, касцёлы!
Тваё ўсё: гэта поле і луг,
А ў палацах будуй сабе школы.

Ідзі-ж смела і чэсна ўпярод
Разам з намі дарогай адзінай:
Мудры Сталін вядзе свой народ
Самай вернай і простай пуцінай.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою:
Многа новых, шчаслівых дарог
Расцілае жыццё прад табою.

## НЕЗАБЫВАЕМЫЯ ДНІ

Сёння доблесная Чырвоная Армія і увесь 193-мільённы совецкі народ адзначаюць слаўную гадавіну вызвалення народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Мне, як удзельніку вызваленчага пахода, успамінаюцца незабываемыя дні баёў з бандамі афіцэраў, асаднікаў за благапалучча і шчасце абяздоленага народа, гадамі ўгнетаемага польскімі панамі.

16 верасня ў 22 гадзіны вечара батальённы камісар зачытаў баявы загад аб пераходзе дзяржаўнай граніцы. Байцы, камандзіры і палітработнікі з затоеным дыханнем слухалі гэты загад. Раздалося грамавое «ура», зліўшаяся ў магутны неспыняемы паток.

Пяць гадзін раніцы. У небе ўзвілася ракета. Часці Чырвонай Арміі магутнай лавінай абрушыліся па ворага. Баявыя машыны разрушылі дротавыя загароды. Перапалоханыя афіцэры адкрылі са стражніцы беспарадачны кулямётны агонь, але гранаты і снарады, метка трапляючыя ў цэль, змялі з твару зямлі «удалых ваяк». Шлях на Радашковічы быў адчынен.

За дзень 17 верасня мы прайшлі 75 кілометраў. Гэта было па існіне пабеданоснае шэствіе слаўнай Чырвонай Арміі. Польскія часці, кіруемыя бездарнымі афіцэрамі, кідаючы зброю, разбягаліся куды папала.

Пры ўступленні ў Радашковічы нас віталі з хлебам-соллю, букетамі кветак родныя браты-беларусы.

— Мы доўга вас чакалі, дарагія, — гаварылі яны.

Затым мы ўзялі напрамак на Гродна.

Да горада падышлі 19 верасня вечарам. Завязаўся бой. Нашы бронетанкавыя часці зламалі пярэднюю лінію абароны праціўніка.

Рашучым штурмам 20 верасня к 12 гадзінам дня Гродна быў узят. У ваколіцах паўночнай часткі горада бой цягнуўся да позняга вечара. Але ніякія сілы не маглі стрымаць невіданага парыва магутнай арміі краіны Советаў.

На ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі была ўстаноўлена совецкая ўлада. Пачалося новае радаснае жыццё.

**КАВАЛЕВІЧ,**
**камандзір запаса, студэнт V курса гістарычнага факультэта.**

